*УДК 37.017.4*
***Р. У. Серыкаў***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# РЫТУАЛЬНЫ ПАТРЫЯТЫЗМ ЦІ ЖЫВОЕ ПАЧУЦЦЁ: ДЫЛЕМА СУЧАСНАЙ ВЫХАВАЎЧАЙ ПРАКТЫКІ

Няцяжка заўважыць, што аблічча Гомеля значна змянілася за апошнія пяць год. Аналіз змены функцыі дзяржаўнай сімволікі ў гарадскім асяроддзі выяўляе яе эвалюцыю: ад прыкметы свята – мабілізацыйнага, ўрачыстага і часава абмежаванага – да пастаяннага, будзённага, абумоўленага элемента постсавецкага пейзажнага дызайну з абмежаванай каляровай гамай. Гэты пераход ад гістарычнага сімвалу-падзеі да штодзённага сімвалу-фона азначае яго функцыянальную дэвальвацыю: сімволіка, страціўшы цыклічнасць і звязанасць з асабістай эмоцыяй ад набліжэння свята, пераўтвараецца ў нефункцыянальны, амаль надакучлівы ландшафтны дадатак, які ўспрымаецца не як складнік святочнасці, а як частка афіцыйнага навакольнага асяроддзя. Такім чынам, яна набывае рысы сталага ладу, але губляе сваю першапачатковую мабілізуючую і эмацыянальную сілу. Стасунковае параўнанне са сталіцай толькі падкрэслівае гэтую асаблівасць: паводле назіранняў многіх гамяльчан, у Мінску адсутнічае такая шчыльнасць размяшчэння афіцыйнай атрыбутыкі ў гарадскім асяроддзі.

Псіхалагічны эфект гэтай трансфармацыі заключаецца ў фундаментальным зруху ўспрыняцця: пераход ад стану «перадсвяточнага ўздыму», звязанага з чаканнем выхадных да стану хранічнага «візуальнага шуму». У гэтым шуме сімвалы, страціўшы сваю выключнасць і цыклічнасць, перастаюць вылучацца. Іх пастаянная прысутнасць выклікае не падсвядомае ўзгадненне насторою з важнай падзеяй у лёсе народа (Дзень Перамогі, Дзень Абаронца Айчыны), а прагрэсіруючую агітацыйную (або сімвалічную) стомленасць – псіхалагічны адваротны эфект, калі інтэнсіўнае і паўторнае прэзентаванне вядзе не да прыняцця, а да прытуплення рэакцыі і нават ўнутранага адарвання. Калі сімвал бачны заўсёды і ўсюды, ён перасягае парог свядомага ўспрымання, перастае быць актыўным сімвалам-пасланнем і непазбежна дэградуе да статусу пасіўнага, непрыкметнага фону. Такі фон не мабілізуе, не натхняе і не аб'ядноўвае – ён проста існуе як частка ландшафту, як прыкмета афіцыйнасці, якая ўжо не арганізуе свядомасць, а толькі фіксуе яе звыкласць да пэўнага парадку рэчаў.

У многіх нашых сучаснікаў, чыё дзяцінства прыйшлося на 1970-я–1980-я гады, школьнымі настаўнікамі былі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Яны надзявалі ордэнскія калодкі толькі напярэдадні значных святаў, падкрэсліваючы асаблівасць дарагіх ім знамянальных дат і ўскрашаючы памяць аб мінулым. У такія дні мы раптам «апаміналася», пераставалі свавольнічаць у прысутнасці ветэранаў, разумеючы, хто перад намі. Іх ордэны і медалі былі баявымі. Яны не насілі гэтыя знакі прызнання іх подзвігу ў штодзённай мітусні. Гэтая свядомая стрыманасць і цыклічнасць надавалі дзяржаўным знакам таго часу сакральны сэнс і эмацыйную магутнасць, робячы яе не фонам, а *падзеяй*.

Назіраючы за тым, як дзяржаўная сімволіка выкарыстоўваецца ў якасці інструмента масавай камунікацыі, можна вылучыць чатыры ўстойлівыя прыкметы яе шаблоннага, «плакатнага» ўжывання:

1. Дамінаванне колькасці над якасцю і сэнсам: ацэнка эфектыўнасці ідэалагічнага ўздзеяння зводзіцца да механічнага падліку адзінак сімволікі (колькі сцягоў, гербаў размешчана), а не да аналізу яе ўнутранага напаўнення, эмацыйнага рэзанансу і таго, які сапраўдны сэнс яна нясе для асобнага чалавека.

2. Сталая паўтаральнасць: візуальны шэраг абмяжоўваецца адным і тым жа вельмі вузкім наборам вобразаў, сітуацый і колеравай гамы (чырвона-зялёны дыяпазон), што вядзе не да паглыблення ўспрымання, а да хуткага прывыкання і змяншэння

псіхалагічнага ўздзеяння да нуля. Гэта пазбаўляе сімволіку магчымасці развіцця і дыялогу з новымі культурнымі кантэкстамі.

3. Маналагічнасць і адсутнасць дыялогу: сімвал функцыянуе не як запрашэнне да развагі, супольнага перажывання або крытычнага асэнсавання, а як гатовае, непахіснае паведамленне-загад. Ён не пытаецца, а заяўляе, не выклікае дыскусію, а яе замяшчае. Такім чынам ён працуе на завяршэнне думкі, а не на яе запуск.

4. Знешняя прымусовасць і абумоўленасць: яго прысутнасць у асяроддзі чалавека не вынікае з яго асабістага выбару або грамадскай ініцыятывы, а прыходзіць зверху ў якасці абавязковай нормы афармлення. Гэта фарміруе не ўнутраную схільнасць, а абрадавую паводніцкую рэакцыю на вонкавы загад, што з’яўляецца процілегласцю сапраўднага, асабіста перажытага пачуцця. У выніку такі патрыятызм працуе не на глыбіню пачуцця, а выхоўвае, плакатную паводніцкую рэакцыю («трэба любіць!»). Гэта патрыятызм выгляду, а не падзей.

Асновай жывога, сапраўднага патрыятызму з’яўляецца прынцыповая змена фокуса: ад пасіўнага спазнання ўніфікаваных сімвалаў да актыўнага, асабістага асваення і ажыццяўлення яго культурнай і сацыяльнай прасторы. Гэта патрыятызм не назірання, а дзеяння, не засвоенай ідэі, а перажытага вопыту. Цэнтральнае месца ў гэтай парадыгме займае прынцып «малой радзімы». Ён абапіраецца на пазнанні і любові не да абстрактнага вобраза краіны, а канкрэтнага, матэрыяльнага аб’екта, уключанага ў паўсядзённасць: на тых няўлоўных, але моцных адчуваннях, што складаюць душу гэтай прасторы: на дыме з коміна вясковай лазні, што топіцца дровамі; на неперадавальным паху свежай вясновай раллі і перапрэлай саломы, які нясецца з палёў; на зіхценні карасёвых спінаў у зацішнай сажалцы... Для тых, хто «вырас на асфальце», такім жа важным ландшафтам становяцца першыя самастойныя паходы па гарадскіх маршрутах, таямнічыя куткі суседніх двароў, паездкі з бацькамі па наваколлі і сямейныя вечары на дачы, парк культуры і адпачынку Гомеля са стужкай яго алей, фасад дома па Савецкай, упрыгожаны ўнікальнай дэкаратыўнай разьбой, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль – не як музейны экспанат, а як месца жыцця горада. Гэта – першасныя клеткі нашай прыналежнасці да Радзімы. Кожны такі аб’ект – гэта партал у глыбіню, які раскрываецца праз:

– гістарычныя факты, экалагічныя асаблівасці, імёны былых жыхароў або архітэктараў: Петрапаўлаўскі сабор з яго званіцай, парк «Фестывальны», «Партызанская крынічка».., што пераўтварае нейтральную прастору ў апавяданне;

– асабістыя ўспаміны: дзіцячыя гульні ў двары, першае каханне, рыбалка на Дняпры пад Лоевам, на Прыпяці ці на Сажы за Чонкамі, студэнцкія прагулкі ў скверах і парках горада, дзе мінулае пакідае моцны эмацыянальны след;

– цэльнасць перажытага: адчуванне прыналежнасці, спакою, натхнення або нават тугі, якое выклікае гэтае месца. Такая сувязь пабудавана не на павіннасці, а на пачуццёвым рэзанансе.

Такім чынам, «малая радзіма» становіцца не памяншальнай версіяй «вялікай», а яе першаснай і непадробнай клеткай. Любоў да краіны перастае быць ідэяй – яна ўвасабляецца ў суму жывых, цёплых адносін да мілых сэрцу куткоў, людзей, гісторый і ландшафтаў, з якіх яна складаецца. Калі чалавек адчувае адказнасць за свой двор і цікавіцца гісторыяй свайго дома, ён ужо апынуўся ў прасторы сапраўднага, не рытуальнага патрыятызму. Гэтая прастора будуецца на трох непадзельных прынцыпах:

1. Патрыятызм як дзеянне, а не назіранне: не глядзець на сімвалы, а ўпарадкаваць пад’езд, дапамагчы суседзям, стварыць краязнаўчы маршрут, захаваць архіўны фатаздымак, пасадзіць дрэва. Гэта патрыятызм уплыву і адказнасці.

2. Патрыятызм як памяць, а не парад: не ўрачыстасць, а разуменне (часта горкае і складанае) гістарычнага шляху свайго народа праз даследаванне лёсаў звычайных людзей, што жылі ў гэтым доме, а не толькі вялікіх герояў. Гэта стварае сувязь пакаленняў.

3. Патрыятызм як культура, а не ідэалогія: павага да мовы, літаратуры, фальклору, традыцый рамеснага майстэрства не па загадах, а з прычыны іхняй унутранай прыгажосці і глыбіні.

На шчасце, такі падыход – не толькі тэарэтычная пабудова. Ён знаходзіць сваё жывое ўвасабленне ў шматлікіх метадычных распрацоўках беларускіх педагогаў-практыкаў, якія імкнуцца пераадолець фармалізм праз сутнасную сувязь з месцам і дзеяннем. Прыкладам гэтай агульнай тэндэнцыі можа служыць абагульнены досвед настаўнікаў, якія бачаць у турысцка-краязнаўчай дзейнасці ключ да актыўнага выхавання. Яны падкрэсліваюць, што *«краязнаўства цесна звязана з турызмам. <...> цяжкасці паходнага жыцця выхоўваюць вытрымку і ініцыятыўнасць, у паходах фарміруецца калектыў, дзе кожны ярка праяўляецца як асоба»* [3, с. 33]. Гэта і ёсць чыстае ўвасабленне «патрыятызму дзеяння», дзе прымус замяняецца асабістым перажываннем і пераадоленнем. Такія практыкі, як гэтая, – толькі адзін са шматлікіх пластоў таго багатага метадычнага фонду, што сёння прапануюць айчынныя спецыялісты, каб вярнуць выхаванню яго сапраўдны, нефармальны сэнс. Беларусь прапануе багатую палітру маршрутаў для жывога краязнаўчага адкрыцця: ад гістарычных сцежак па панскіх сядзібах і літаратурных мястэчках да прыродных вандровак па ўнікальных ландшафтах Палесся і Браслаўшчыны, Белавежы і Нарачы, а таксама малавядомых куткоў з іх аўтэнтычнай атмасферай і традыцыйнымі рамёствамі [1], [2] і інш.

Толькі такім чынам, калі адказнасць за пэўнае месца (дзеянне) напаўняецца разуменнем яго мінулага (памяць) і асэнсаваннем яго духоўнага зместу (культура), пачуццё набывае сапраўдную сілу, якую немагчыма стварыць дэкрэтам або вымераць колькасцю сцягоў. Роля устаноў вышэйшай адукацыі ў выхаванні жывога пачуцця – не абмяжоўвацца толькі перадачай ведаў, а ствараць умовы для яго асабістага адкрыцця і перажывання. Гэта патрабуе пераадолення чыста дыдактычнага падыходу. Замест лекцый «пра патрыятызм» эфектыўнейшай з'яўляецца праектная і даследчая дзейнасць, калі студэнты самі ствараюць лічбавы архіў мясцовай славутасці, запісваюць інтэрв'ю са старажыламі або аналізуюць, як адлюстроўваўся іхні горад у розныя эпохі ў літаратуры і дакументах. Праз такую працу адбываецца паўнавартасны дыялог з мінулым: студэнтаў навучаюць не толькі запамінаць даты, але і ставіць складаныя этычныя пытанні да нашай драматычнай гісторыі. Пры гэтым галоўная задача ўніверсітэта застаецца нязменнай: гадаваць не абстрактных «пераможцаў», а адказных спецыялістаў, якія шануюць сваю прафесію і імкнуцца рабіць сваю справу якасна менавіта тут, на карысць сваёй краіны. Менавіта ў гэтым сінтэзе – паміж асабістым даследаваннем роднага кантэксту і выхаваннем прафесійнай годнасці – і фарміруецца той сапраўдны, асэнсаваны падмурак жывога пачуцця прыналежнасці да свайго месца, сваёй культуры і сваёй прафесійнай супольнасці.

Такім чынам, галоўны парадокс заключаецца ў тым, што патрыятызм, зведзены да плаката, дэградуе да сваёй процілегласці. Празмернасць і беспадстаўная паўтаральнасць выклікаюць не падтрымку, а востры антыдот – стомленасць і абыякавасць. Надзвычай трапны прыклад аб празмернасці – у Старым запавеце, у Кнізе Прыповесцяў 25:16: «[Як] знайшоў мёд, еш, колькі трэба табе, каб ты не пераеў і не званітаваў» [4, с. 958].

Адсюль вынікае галоўная задача сучаснай выхаваўчай сістэмы: адмовіцца ад пустога рытуалу і навучыць маладую асобу знаходзіць уласныя, жывыя і нематэрыяльныя асновы для пачуцця глыбокай сувязі з родным краем і яго гісторыяй. Такімі асновамі могуць быць толькі рэчы, звязаныя з памяццю, культурай, канкрэтнымі дзеяннямі і месцамі. Бо сапраўдны патрыятызм ціхі. Ён не крычыць са шчытоў – ён жыве ў штодзённых справах, у глыбокім веданні і ў шчырай павазе да кожнай падрабязнасці «малой радзімы».

Справа, такім чынам, не ў сімволіцы самой па сабе – яна застаецца важным знакам супольнасці, – а ў тым, калі яна перастае быць знакам і трансфармуецца ў прымусовы

фон, страчваючы сувязь з жывой культурай і памяццю. Менавіта гэтае пераўтварэнне сімвала ў атрыбут наваколля робіць яго выкарыстанне недарэчным і контрпрадуктыўным. Канструктыўны ж шлях ляжыць у звароце да таго, што́ імкнецца ўвасобіць сапраўдны сімвал: да жывой традыцыі, асэнсаванай памяці і добрых спраў. Такі падыход і з'яўляецца лагічным і плённым пасылам для любога грамадзянскага дыскурсу.

## Літаратура


1. Беларусь //Tourister.ru : турыстычны партал [Электронны рэсурс]. – URL: https://www.tourister.ru/world/europe/belarus (дата звароту: 24.12.2025).
2. Ремесленная Беларусь = Remeslennaya Belarus : [афіцыйны сайт пра рамёствы і этнатурызм] [Электронны рэсурс]. – URL: https://welcometobelarus.ru/blog/remeslennaya-belarus.html (дата звароту: 24.12.2025).
3. Саханькова, В. У. Турызм і краязнаўства развіваюць, выхоўваюць, загартоўваюць. Шляхі і сродкі грамадзянска-патрыятычнага выхавання школьнікаў / В. У. Саханькова, А. М. Нікалаевіч // Народная асвета : штомесячны навукова-педагагічны часопіс. – 2025. – № 12. – С. 33–36.
4. Свяшчэннае Пісанне Старога і Новага Запаветаў / пераклад А. Бокун. – Мінск : Саюз ЕХБ у Рэспубліцы Беларусь, 2024. – 1762 с.